*Мікалай Іваненка*

# СУЧАСНАЯ ШКОЛА І ЭТНАВЫХАВАННЕ

Беларускі філосаф Валянцін Акудовіч, разважаючы пра беларускасць, выказаў меркаванне, што «этнакультурная канцэпцыя» фарміравання беларускай нацыі не павінна быць базавай стратэгіяй [3, с. 2]. Далей філосаф, супярэчачы самому сабе, гаворыць: «Без сваёй краіны я быў бы толькі аблачынай у чужым небе, а без сваёй мовы не сябе б выказваў, а фікцыю з прозвішчам Акудовіч. Але... амаль ніхто з шараговых беларусаў нават не шкадуе, што ў ягоным жыцці ды лёсе беларускасці як кот наплакаў. З гэтага відавочнага факта і паўстаў мой трывожны недавер да «этнакультурнай» канцэпцыі» [3, с. 2].

Шкада, што сярод нас сапраўды шмат «шараговых» беларусаў, але ўсё ж хочацца верыць, што больш людзей, якім не абыякавы лёс роднай мовы і культуры, лёс дзяржавы і сённяшніх дзяцей, якія стануць яе будучыняй. Каб яны не сталі аблачынамі ў чужым небе і не было сярод іх фікцый з беларускімі прозвішчамі, трэба выхоўваць нашчадкаў на аснове нацыянальнай этнакультурнай канцэпцыі з хрысціянскім светапоглядам, які натуральна пазбаўляе нацыяналістычных афарбовак і дае моцны духоўны і маральна-этычны падмурак для развіцця культуры і дзяржаўнасці.

Мы сёння шмат гаворым пра неабходнасць актывізацыі патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання дзяцей і моладзі, каб годна супрацьстаяць таму шквалу разбэшчанасці і тлуму, які хлынуў з тэлеэкранаў, інтэрнэта і іншых сродкаў масавай інфармацыі. У такіх умовах было б проста не даравальным не выкарыстаць велізарны выхаваўчы патэнцыял этнапедагогікі і традыцыйнай культуры беларусаў, які грунтуецца на высокіх маральных каштоўнасцях хрысціянства і нясе ў сабе ідэю беларускасці з яе талерантнасцю, цярплівасцю і адкрытасцю да іншых культур. Дзяржаве неабходна развіваць і мацаваць свой суверэнітэт і незалежнасць. Таму яна зацікаўлена ў выхаванні сапраўдных патрыётаў сваёй зямлі па духу, а не толькі праз законы і грошы.

Здаецца ўсе мы: і педагогі, і дзяржаўныя структуры – зацікаўлены ў захаванні беларускай культуры, а значыць, і ў пашырэнні этнавыхавання, але на практыцы бачым, як падае агульная цікаўнасць не толькі да традыцыйнай культуры, але і да мовы, а яна – аснова культуры і нацыянальнай адметнасці. Праз эксперыментальныя этнашколы мы навукова даказалі, што этнавыхаванне мае велізарны патэнцыял для сапраўды гарманічнага развіцця асобы і з кожным годам назіраем, як скарачаюцца магчымасці выкарыстання гэтага патэнцыялу ў сучасных установах адукацыі.

Патрыятычнае выхаванне не можа быць без выхавання нацыянальнай (этнічнай) самасвядомасці. А самасвядомасць, у сваю чаргу, можна ўмоўна раздзяліць на нацыянальную свядомасць (што я ведаю і думаю пра сваю нацыю) і нацыянальную тоеснасць (што я ведаю і думаю пра сябе як прадстаўніка сваёй нацыі). Калі для першай складаючай можа і дастаткова толькі ведаў, то для другой іх мала. Трэба развіваць канкрэтныя ўменні і навыкі, выхоўваць носьбіта традыцыйнай культуры. Каб чалавек не толькі ведаў гісторыю і культуру сваёй нацыі, але і адчуваў сябе часцінкай гэтай нацыі праз далучэнне да яе культуры.

Захаванне нацыянальнай адметнасці немагчыма зараз без апоры на ўстановы адукацыі і стварэння цэласнай сістэмы выхаваўчай работы. Пачатак такой сістэмы быў закладзены этнашколай, якая даволі паспяхова працавала ў рэспубліцы на працягу больш як пятнаццаці год. Першыя гады жыцця этнашколы ў Вілейцы былі вельмі складанымі. Мы распрацоўвалі канцэпцыю этнавыхавання, метадычныя парады па выкладанні спецыяльных прадметаў, сцэнарыі заліковых фальклорных мерапрыемстваў, сустракаліся з носьбітамі традыцыйнай культуры на Вілейшчыне і збіралі мясцовы фальклорны матэрыял. Паралельна ішло навучанне настаўнікаў, працавалі метадычныя аб'яднанні па розных накірунках этнавыхавання сучасных школьнікаў. На базе пачатковай школы № 6 і гімназіі № 2 (пазней далучыўся і дзіцячы садок № 11) рыхтаваліся і праводзіліся рэгіянальныя, абласныя і рэспубліканскія навукова-практычныя семінары і канфкрэнцыі. Вяліся спрэчкі, у якіх часта сапраўды нараджалася ісціна. Работы было шмат, але і плён быў відавочным, таму і працаваць хацелася яшчэ больш. Калі фальклорныя калядныя гурты выходзілі з двара школы, гараджане збягаліся паглядзець. Сярод нашых прыхільнікаў былі не толькі людзі сталага ўзросту, а шмат моладзі і асабліва дзяцей. Трэба было бачыць іх твары! Я больш чым упэўнены, што беларускасць жыве ў кожным з нас на падсвядомым узроўні, толькі трэба яе разбудзіць, і яна дасць чалавеку жыццёвыя сілы і радасць.

У звычайных школах, калі вучань не можа засвоіць агульнашкольныя прадметы на высокім узроўні (гэта не кожнаму дадзена!), то ён вельмі рэдка мае (а можа і ніколі не мае!) публічна прызнанага поспеху. Школьнае жыццё такіх вучняў становіцца шэрым і нецікавым. Этнашкола стварала ўмовы развіцця і творчага росту для кожнага свайго вучня, развівала творчую смеласць і ўпэўненасць у сабе. Кожны вучань пастаянна трапляў у сітуацыю прызнанага ўсімі (сябрамі, настаўнікамі, бацькамі, гледачамі) поспеху, і гэта ўмацоўвала яго душэўныя сілы, дапамагала больш дасканала засвойваць і праграмы па агульнавучэбных прадметах.

У этнашколе шырока выкарыстоўваліся лепшыя здабыткі народнай педагогікі, у аснову якой пакладзены такія прынцыпы, як гуманізм, пераемнасць, непарыўнасць выхаваўчага ўздзеяння, выхаванне працай і ў працы, сувязь з рэальным практычным жыццём, веданне народнага календара і ўжытковага асяроддзя, заахвочванне самастойнасці, развіццё індывідуальных здольнасцей і раскрыццё творчых задаткаў. Гэтыя прынцыпы найбольш эфектыўна працавалі раней ва ўмовах сям'і, дзе найважнейшую ролю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адыгрываў маральна-псіхалагічны клімат, традыцыйныя ўнутрысямейныя ўзаемаадносіны паміж бацькамі, бацькамі
і дзецьмі, старэйшымі і малодшымі братамі і сёстрамі, адносіны да састарэлых бабуль і дзядуль, а таксама знешнесямейныя адносіны са сваякамі, кумамі, суседзямі, сябрамі і іншымі людзьмі.

Перайманне традыцыйнай культуры адбывалася ў натуральных умовах жыццядзейнасці. Ніхто не быў у ролі настаўніка ці вучня і, тым больш, у ролі пасрэдніка. Дзіця з першых дзён свайго жыцця чула калыханкі, забаўлянкі, казкі; падрастаючы забаўляла імі сваіх меншых братоў і сясцёр, потым, у дарослым узросце, паўтаралася ўсё для сваіх дзяцей, а ў старасці - для ўнукаў. Падобнае паслядоўна і арганічна адбывалася і з засваеннем іншых форм фальклору, сямейнай і каляндарнай абраднасці, працоўных і жыццёвых навыкаў.

Асноўнымі выхаваўчымі ўзорамі для дзяцей у даўнейшыя часы былі прыклады асабістага жыцця іх бацькоў, якія трымалі аўтарытэт і патрабавалі ад дзяцей паслухмянасці, дысцыплінаванасці, умення дакладна і хутка выконваць хатнія даручэнні. Бацькоўская навука выхавання ў беларускай сям'і засноўвалася на народных уяўленнях, якім павінен быць чалавек і як гэтага дасягнуць, каб жыць у згодзе найперш з Богам,
а потым з людзьмі, з самім сабой, з наваколлем. Дзеля гэтага бацькі імкнуліся выхаваць дзяцей працаздольнымі і ашчаднымі, добрасумленнымі і ветлівымі, фізічна здаровымі, без шкодных звычак.

Спрадвечныя ўяўленні пра дабро і справядлівасць перадаваліся дзецям праз народную мараль, якая апошняе тысячагоддзе трымалася і сілкавалася ад высокай маралі хрысціянства. Усе сем'і былі ўвацаркаўлёнымі і жылі ў строгім выкананні агульнапрынятых правілаў, стараліся выконваць запаветы Хрыста.

З разбурэннем былога ўкладу жыцця, узаемаадносін сямейных, родавых, грамадскіх адбыўся і збой у традыцыйнай перадачы духоўных, культурных, працоўных каштоўнасцей, ведаў і навыкаў.

У нашы дні носьбітаў традыцыйнай культуры на Вілейшчыне вельмі і вельмі мала, і з кожным годам становіцца ўсё менш. Яны адыходзяць, а разам з імі знікаюць і адметныя культурныя традыцыі кожнай вёскі. Ну а пакуль такія людзі ёсць, то мае сэнс працягваць працу па зборы, пераніманні і захаванні фальклорнай спадчыны.

У працэсе этнанавучання і выхавання сёння патрэбны новыя падыходы, новыя тэхналогіі, новыя методыкі. Нацыянальная свядомасць, патрыятызм і жаданне быць носьбітам традыцыйнай культуры не прыходзяць разам з апрананнем народнага касцюма. Працэс гэты вельмі складаны. Ён найперш патрабуе падрыхтаванасці настаўнікаў. Ад іх прафесіяналізму, асабістай зацікаўленасці і любові да фальклорнай спадчыны, ад умення працаваць з дзецьмі і весці размову з носьбітамі традыцыйнай культуры залежыць вынік усёй гэтай складанай і адказнай справы. Вілейскай гімназіі № 2 з настаўнікамі пашанцавала. Мы ганарымся тым, што ў нас працуе настаўніца фальклорнага танца Зінаіда Васільеўна Крупская, якая сама з'яўляецца адным з самых цікавых і багатых носьбітаў традыцыі на Вілейшчыне; у нас працуюць цудоўныя фалькларысты: Крысціна Іванаўна Гардынец, Міхаіл Уладзіміравіч Ермаковіч, Таццяна Валер'еўна Каркотка, Таццяна Яраславаўна Адамовіч, Таццяна Пятроўна Матусевіч, Святлана Фёдараўна Габрыновіч, Алеся Мікалаеўна Гіль, Аксана Тадэвушаўна Паўлоўская і многія іншыя. Мы шчыра ўдзячны Мікалаю Аляксеевічу Козенку, Тамары Барысаўне Варфаламеевай, Алене Міхайлаўне Боганевай, Таццяне Аляксандраўне Пладуновай, Вячаславу Віктаравічу Калацэю і многім іншым вядомым фалькларыстам рэспублікі за творчае супрацоўніцтва і пастаянную падтрымку той працы, якую працягваюць настаўнікі, вучні і бацькі гімназіі.

Сёння кожны, хто займаецца выхаваннем, павінен ведаць гісторыю і культуру свайго народа, яго мову, святы, абрады і традыцыі, яго мастацкія рамёствы і побыт. Таму на дзяржаўным узроўні павінны быць распрацаваны навуковыя канцэпцыі выкладання спецыяльных прадметаў, праграмы, падручнікі і дапаможнікі не толькі для дзяцей, з улікам узросту і рэгіёну пражывання, але і для студэнтаў усіх педагагічных спецыяльнасцей. Паралельна з народнай культурай трэба абавязкова выкладаць гісторыю хрысціянства і асновы хрысціянскай веры. Такі падыход дапаможа глыбей вывучыць і зразумець гісторыю і культуру беларусаў, бо яны непарыўна звязаны з хрысціянствам.

Шкада тых вучоных і фалькларыстаў, якія змешваюць язычніцтва і хрысціянства, або свядома праз фальклор робяць спробы адраджэння паганскага светапогляду. Такая праблема існавала і ў некаторых этнашколах рэспублікі. Абрадавым дзеянням надавалася значэнне магічнага рытуалу, у які ўцягваліся настаўнікі і вучні.

Ілля Іванавіч Сучкоў, якога, на жаль, ужо няма, быў аўтарам ідэі этнашколы, кіраўніком гэтага ўнікальнага праекта на Беларусі і шчырым ідэолагам этнавыхавання. Але, атрымаўшы ў савецкія часы атэістычную адукацыю, ён не ведаў хрысціянства, а таму і не змог зразумець і ацаніць яго ролю ў гісторыі нашага народа. У сваёй кнізе «Фальклорны тэатр і фарміраванне асобы» ён пісаў: «У рэлігійным выхаванні мы імкнемся здзейсніць асветніцкі падыход Ж.Ж. Русо. На нашых школьных сцягах напісаны шырока вядомыя яго словы: «...Мы не станем далучаць дзіця ні да той, ні да другой рэлігіі, а дадзім яму магчымасць абраць тую, да якой павінен прывесці яго найлепшым чынам накіраваны розум» [2,19]. Цікавы падыход да выхавання, які наўрад ці можна прымяніць на практыцы. З дапамогай чаго ж тады можна накіраваць розум «найлепшым чынам»? Даваць чалавеку веды, не фарміруючы пры гэтым светапогляду, усё роўна што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карміць і не даваць піць. Адчуе невыносную смагу і нап'ецца сам. Дзе гарантыя, што не з бруднай крыніцы? Ці не будзе віны на тым, хто своечасова не паказаў свайму дзіцяці, адкуль можна і трэба піць.

Пры разумным падыходзе этнапедагогіка можа быць і сёння невычэрпнай крыніцай ідэй, неабходных для вырашэння сучасных педагагічных задач па выхаванні духоўна і фізічна здаровага чалавека. Вынік такой працы будзе найбольш эфектыўным, калі яна праводзіцца ў адпаведнай сістэме і паслядоўнасці, на працягу ўсіх гадоў выхавання, пачынаючы з сям'і, дзіцячага садка і працягваючы на першай, другой і трэцяй ступенях агульнаадукацыйнай школы, сярэдне-спецыяльных і вышэйшых адукакцыйных устаноў.

Рыгор Шырма ў сваёй кнізе «Песня – душа народа» адзначаў: «Ва ўсім цывілізаваным свеце родная мова ёсць асноваю, якая лучыць усе прадметы школьнага курса, якая праходзіць праз усе яго часткі. Трэба ведаць, як любоўна народы распрацавалі праграмы мовы ў сваіх школах! Французы, немцы, ангельцы, расейцы будуюць усё ўзгадаванне на скарбах роднай мовы... Застаецца два шляхі: або павольнае нацыянальнае кананне, або ўпартае змаганне за сваю мову» [4, С. 62-63]. Такую выснову робіць славуты наш зямляк яшчэ ў савецкія часы, калі ва ўсіх вясковых школах і многіх гарадскіх прадметы выкладаліся толькі на беларускай мове. Зараз жа нават гісторыя Беларусі выкладаецца на рускай, мова ж родная застаецца для многіх дзяцей незразумелай і непатрэбнай.

Прайшоў час, змянілася жыццё, памяняліся людзі, вобраз іх мыслення і стыль паводзінаў. Мы ніколі не вернемся да мінулага традыцыйнага ўкладу жыцця, і такая задача не стаіць сёння перад этнавыхаваннем. Задача – выхоўваць нашых дзяцей сапраўднымі беларусамі, якія ведаюць гісторыю і культуру свайго народа і ганарацца імі, якія ведаюць родную мову і не саромеюцца гаварыць на ёй, якія маюць карысныя працоўныя і традыцыйна-культурныя навыкі і, карыстаючыся імі, свядома далучаюцца да гістарычнай памяці, якія маглі б жыць годна, прыгожа і творча ў квітнеючай Беларусі.

**Спіс літаратуры:**

1. Асабісты архіў Іваненкі М.М. (Запісана ў 1998 годзе ад Высоцкай Л.І. з вёскі Багданава Вілейскага раёна).
2. Сучкоў, І.І. Фальклорны тэатр і фарміраванне асобы / І.І. Сучкоў. – Мінск : НІА, 2001. – 234 с.
3. Цімошык, Л. Ад «Дудкі беларускай» да думак пра Беларусь / Л. Цімошык // Звязда. – 2010. – 15 снежня.
4. Шырма, Р. Песня – душа народа : З літаратурнай спадчыны / прадм. Н. Гілевіча ; уклад., камент. і бібліягр. В. Ліцвінкі. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 167 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ